# Летапіс

# вёскі Падольцы

# і яе наваколля

# З любоўю аб родным краі

*Можаш быць хоць у сотні мясцінах,*
*Хоць паўсвету прайсці, абляцець,*
*Ёсць куточак на свеце адзіны,*
*Па ім сэрца не кіне балець.*

*Л. Валодзька*

# Візітка вёскі Падольцы

Падольцы - вёска ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці. Цэнтр сельскага Савета і саўгаса «Падольскі», за 45 км на Поўнач ад Астраўца, 300 км ад Гродна, 50 км ад чыгуначнай станцыі Гудагай, на аўтадарозе Кемелішкі - Астравец.

Саўгас, лясніцтва, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы садок, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексна-прыёмны пункт, аддзяленне сувязі, АТС, 2 магазіны, помнік 19 аднавяскоўцам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. (2016).

Першыя пісьмовыя звесткі аб вёсцы адносяцца да 1572 года.

У інвентарах пазначана, што уладанні пана Юрыя Осціка, якому належалі Свіранкі, павялічыліся за кошт набыцця в. Падольцы, у якой было 12 дамоў.

# Адкуль ў вёскі імя

Амаль кожны населены пункт мае сваё імя, адзін названы ад імя бягучай побач рэчкі, другі па возеру, на якім размешчаны, трэці - ад імя першага жыхара, які тут пабудаваўся. Ёсць сваё імя і ў вёскі  Падольцы.

Наконт назвы вёскі ёсць некалькі меркаванняў, але бадай самай праўдападобнай версіяй з'яўляецца тая, што назва Падольцы ўзнікла ад слоў «дол», «даліна», значыць, тая, якая размешчана ў даліне.

Праз вёску працякала невялічкая  рачулка, на месцы якой зараз выкапаны вялікі стаў. Першыя хаціны з'явіліся па даліне гэтай рачулкі (старая частка вёскі да маста). Забудова астатняй часткі Падольцаў (цэнтр) адбывалася пазней, менавіта пасля вайны.

# Тыповыя для вёскі прозвішчы

Самым распаўсюджаным прозвішчам для нашай вёскі, безумоўна, з’яўляецца прозвішча Валодзька. Паходзіць яно менавіта ад слова “валока”. Сяляне валодалі зямлёй, якая вымяралася валокамі, з валокі плацілі падатак. Заможныя сяляне валодалі валокай зямлі (21,3 га), меней заможныя, а іх было большасць, валодалі ½ валокі, былі такія, якія валодалі ¼ валокі, так званай “валочкай”.

Ад назвы “валочка” і пайшло прозвішча Валодзька, што і стала тыповым для нашай вёскі.

Чыста падольскімі з’яўляюцца яшчэ прозвішчы: Бакевічы, Буйкі, Пільвінскія, Ступенькі, Печатоўскія.

# Аб чым расказваюць могільнікі:

**Вёска  Малыя Свіранкі**

Курганы могільнік (археалагічны) за 1,1 км на паўночны усход ад вёскі, справа ад лясной дарогі 5 насыпаў дыяметрам 8-13 м, вышыней 0,6-1,7 м. Выявіў і абследваў у 1976 годзе Я. Г. Зваруга. Раскопкі не праводзіліся.

**Вёска Пільвіны**

Курганы магільнік за 1,3 км на поўдзень ад вёскі, за 0,7 км на поўнач ад правага берага ракі Вілія на месцы хутара Якубішкі, у лесе 22 насыпы вышынёй да 1,6 м, дыяметрам 6-12 м, выцягнуты з паўночнага захаду на паўдневы ўсход на 280 м.(раней было 36 курганоў). Вакол насыпаў раўкі. Адкрыў і раскапаў 14 курганоў у канцы 19 ст. Ф. В. Пакроўскі.

Пахавальны абрад - трупаспальванне. Знойдзены: жалезныя шылы, сярпы, нож, наканечнік кап'я, спражкі, фібула, гліняная прасліца, бронзавыя ўпрыгожванні, рэшткі рыштунку каня.

Могільнік адносіцца да ўсходнелітоўскіх курганных пахаванняў, датуецца другой паловай І тысячагоддзя нашай эры.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца у гісторыка-этнаграфічным музеі Літоўскай Рэспублікі г. Вільнюса.

**Могільнік № 2**

За 0,3 км на захад ад вёскі 13 насыпаў дыяметрам 9-14 м, вышыней 0,8-1,6 м. Большасць курганоў пашкоджана. Выявіў і даследваў у 1976 годзе Я. Г. Зваруга. Раскопкі не праводзіліся.

# Вёска Падольцы
# ў 2 палове 16 ст. - пачатку 20 ст.

*(З успамінаў М. З. Веські (г. н. 1917) і матэрыялаў гісторыка-этнаграфічнага музея г. Вільнюса).*

Першы ўспамін аб вёсцы адносіцца да 1572 года, калі вёска стала ўладаннем пана Ю. Осціка. Але ужо ў пачатку 18 ст. Падольцы становяцца ўласнасцю паноў Куркоўскіх. Як гэта адбылося, пакуль што высветліць не ўдалося. Вядома толькі, што Куркоўскія валодалі Падольцамі аж да 1939 года. Вёска была невялікай, ўсяго жыло 18 сямей.

На Падольскіх могілках ёсць магілы сям'і паноў Куркоўскіх 18-19 стст.

З успамінаў Веські М. З. высвятляецца, што яшчэ і ў 1930-я гады вёска была невялікая, дзесьці 20-25 сялянскіх гаспадарак.

Там, дзе цяпер адміністрацыйны цэрнтр вёскі, каля парку жыў пан Яўген Куркоўскі, які пасля вучобы у г. Лодзі прыехаў у Падольцы. Жыў ён у бацькоўскім доме. Дом быў вялізны, цантральны ўваход упрыгожвалі вялізныя драўляныя калоны, ад дома ў розныя бакі пралягалі прыгожыя алеі з розных парод дрэў, адна з іх ліпавая і зараз радуе вока не толькі жыхароў вёскі, але і ўсіх наведвальнікаў Падольцаў. (Пазней, пасля вайны, у гэтым доме была грамадская сталовая, магазін, дзіцячы сад, ФАП.)

Побач з домам быў вялікі і прыгожы парк, у якім было больш за 30 відаў розных дрэў (сярод іх сібірская лістаўніца, піхта і г.д.) Асабіста панскай зямлі было не вельмі многа - 12 валок (250 га). Восем сямей сялян амаль штодзённа працавалі ў маёнтку, акрамя таго, ў гарачую вяснавую, летнюю пару пан наймаў парабкаў, для работы ім даваў сваіх коней і весь с/г рыштунак. За работу разлічваўся збожжам (пудамі). У 1939 г. пан уцёк з Падольцаў.

# Прыход савецкай улады

У 1939 г. лёс нашай вёскі супаў з лёсам ўсёй Заходняй Беларусі. На тэрыторыю Заходняй Беларусі ў верасні прыйшла савецкая улада. Паны паўцякалі, панскую зямлю падзялілі, адбываліся выбары у мясцовыя органы ўлады, але ўсе гэтыя мерапрыемствы праводзіліся неяк з аглядкай, ці не вернецца зноў пан, ці не адбярэ зноў зямлю.

Як вядома, у верасні 1939 г. пачалася Другая сусветная вайна і асобных нашых жыхароў яшчэ польскі урад прызваў у войска. Сталі вайскоўцамі войска польскага: Бакевіч Іосіф Францавіч, Буйка Валерыян Якубавіч, Веська Мечаслаў Зузанавіч, Валодзька Іван Адамавіч і іншыя.

Пабыўшы каля 2 месяцаў на польска-германскай вайне, яны вярнуліся дамоў, так як Польшча капітулявала. Былыя вайскоўцы зноў заняліся вядзеннем хатняй гаспадаркі. Сярод вяскоўцаў ужо назіралася расслаенне на заможных і бедных. Заможныя гаспадары мелі па 2-3 кані, 4-5 кароў, ўсе прылады для апрацоўкі палей. Але ураджаі атрымлівалі невысокія, так як зямля была малаўрадлівая, мінеральных угнаенняў не было. Нямецкі акупацыйны рэжым амаль не закрануў насельніцтва Падольцаў, ды ўвогуле і немцаў у Падольцах не было.

У 1944 годзе калі да нашых мясцін дакацілася хваля вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў нашы землякі Буйка В.Я., Веська М.З., Бакевіч І.Ф., Валодзька І.А былі выкліканы у свірскі райваенкамат і зноў апынуліся ў войску, і зноў у польскім, так як лічылі сябе палякамі, а там, па жаданню, была магчымасць ваяваць у Чырвонай арміі, ці Войску Польскім. Бакевіч Іван Францавіч быў связістам у разведцы, Веська М. З. - простым вайскоўцам, Буйка В. Я. - будаваў пераправы праз Буг, Віслу, Валодзька І. А. - быў хлебапекам вайсковай пякарні.

Пасля вайны у вёсцы жылі бедна, асабліва у першы ваенны год - 1946. Елі хлеб з мякінай, вопратка была паркалевая, а абутак -

драўляныя башмакі (калодкі), да якіх былі прыбіты раменныя пасачкі.

Каб пракарміць сям'ю, часта мянялі даматканыя вырабы (яшчэ пасажныя дываны, ручнікі) у Вільні на хлеб (адзін дыван на пуд жыта ці ячменю). Да Вільні дабіраліся рознымі шляхамі: пешшу да станцыі Геледня, а там, калі пашанцуе і маеш спрыт, ехалі на дахах вагонаў, але больш за ўсё хадзілі пехатой. У канцы 1946 года ў нашай мясцовасці канчаткова усталёўваецца Савецкая улада, у Кямелішках, Каранятах ствараюцца, а у Жукойнях аднаўляецца, сельскія Саветы. Падольцы падпадаюць пад юрысдыкцыю Жукойніцкага сельскага Савета, старшыней якога выбіраецца былы партызан Плехаць Мечыслаў Міхайлавіч. Пасля старшыней Жукойніцкага сельскага Савета працаваў Пашына Альбін Іванавіч, а сакратаром сельскага Савета - Плехаць Анастасія Сцяпанаўна. Калі ў 1950 годзе у Падольцах быў створаны сельскі Савет, яна стала старшыней і займала пасаду да 1973 года. Супрацоўнікі сельскіх Саветаў дапамагалі мясцоваму насельніцтву у вырашэнні многіх пытанняў паўсядзённага жыцця, а калі пачалася калектывізацыя (1949-50 гг.), першымі пайшлі у вёскі агітаваць за ўступленне ў калгасы.

Восеньскую сяўбу 1950 года сустрэлі 10 калгасаў, якія былі амаль у кожнай буйной вёсцы (сучасная тэрыторыя саўгаса «Падольскі».)

# З гісторыі калгаснага жыцця

## З успамінаў Бакевіча Іосіфа Францавіча 1917 года нараджэння, першага старшыні калгаса ў вёсцы Падольцы

У 1950 годзе утварыўся наш калгас імя Леніна. Насельніцтва ішло ў калгас пад прымусам, тыя, у каго было 20 і болей гектараў зямлі, лічыліся кулакамі, і калі яны не хацелі запісвацца ў калгас, у іх сілком забіралі жывёлу, зямлю, прылады працы, а саміх высялялі. Вывезлі ў Расію Валодзька Яфіма, Валодзька Ігната і іншых аднавяскоўцаў.

У 1952 годзе пачалося аб'яднанне дробных калгасаў у больш буйныя, так Белавадзянскі калгас і наш Падольскі аб'ядналі у адзін і назвалі «калгас імя Варашылава». Старшыней аб'яднанага калгаса быў абраны Пашына Альбін Іванавіч.

Былы калгас імя Леніна быў дробнай гаспадаркай, меў каля 300 га ворыўнай зямлі, 28 дойных кароў, 50 цялят, 150 авечак, 30 свіней, 35 коней. Землі калгаса апрацоўваліся тэхнікай Падольскай МТС і жывёлай, якая была адабрана падчас калектывізацыі ў людзей.

У былым панскім маёнтку была адкрыта сталовая, спачатку МТС, а затым грамадскага харчавання, магазін, дзіцячы садок, ФАП. На тэрыторыі МТС пабудавалі цэнтралізаваную кацельню, якая забяспечвала цяплом рэмонтныя майстэрні МТС і другія памяшканні. Быў пабудаваны будынак адміністрацыі, два васьмікватэрныя дамы, ветлячэбніца, сельскі клуб. Вёска забудоўлевалася і прыгажэла.

# З гісторыі саўгаса "Падольскі"

## Загад № 1 па саўгасу «Свірскі» ад 10 сакавіка 1959 г.

**п.Падольцы**

«Гэтага чысла прыступіў да выканання абавязкаў дырэктара саўгаса»

Дырэктар с-са П. С. Грынюк

Больш за сорак гадоў аддзяляе нас ад таго сакавіцкага дня, калі ў выніку рэарганізацыі саўгаса «Малыя Свіраны» ( зараз невялікая вёсачка у Кямелішскім сельсавеце) і ўсіх калгасаў, створаных у 1950 годзе ў Падольцах, Рытані, Кямелішках, быў створаны вялікі саўгас «Свірскі», пазней перайменаваны ў «Падольскі».

У саўгасе было шэсць аддзяленняў: Белавадзянскае, Караняцкае, Рытаньскае, Кямелішскае, Свіранскае, Падольскае і 30 брыгад. Кіраўнікамі аддзяленняў працавалі Канстанцін Васільевіч Зімніцкі, Іван Рыгоравіч Малочка, Андрэй Андрэевіч Галачаеў, Рыгор Іосіфавіч Беразоўскі. Загадам №3 ад 14 сакавіка былі прызначаны галоўныя спецыялісты саўгаса: галоўны заатэхнік Старакожава Кацярына Іванаўна, галоўны інжынер Старакожаў Афанасій Мікітавіч, галоўны аграном Асмаковіч Іван Іванавіч, старшы інжынер-будаўнік Калач Фёдар Фёдаравіч, галоўны бухгалтар Куцэвіч Франц Адамавіч. Брыгадзірамі ў жывёлагадоўлі былі прызначаны: у Караняцкім аддзяленні - Іосіф Мікалаевіч Катовіч, у Рытаньскім - Уладзіслаў Валер’янавіч Козел, і шэраг іншых спецыялістаў.

Можа ўзнікнуць пытанне: чаму менавіта Падольцы былі абраны цэнтрам новай гаспадаркі?

Усе проста: на тэрыторыі в. Падольцы знаходзілася створаная у 1960 годзе Падольская машына-трактарная станцыя (МТС), тэхнікай якой абслугоўвалася зямля Кямелішак, Рытані, Падольцаў і ўсей Спондаўскай зоны.

У 1958 годзе МТС была рэарганізавана, ўся тэхніка была перададзена калгасам, якія ў большасці сваёй былі дробныя і слабыя. У Падольцах жа засталася выдатная па тым часе матэрыяльна-тэхнічная база, выдатныя майстэрі з усім неабходным абсталяваннем, а галоўнае - добрыя кадры спецыялістаў. Многія з іх пазней занялі кіруючыя пасады ў іншых гаспадарках і галінах вытворчасці раёна. Да прыкладу, А.А. Галачаёў шмат гадоў кіраваў калгасам «Радзіма", А.М. Старакожаў быў дырэктарам саўгаса «Кямелішкі», І.М. Катовіч - старшыней калгаса, інжынерам аўтакалоны №4 г.п. Астравец, В.С. Астапава - начальнікам планавага аддзела райвыканкама.

Паслужны спісак працаўнікоў саўгаса можна працягваць.

З цягам часу вялікая гаспадарка была падзелена на дзве, а потым і на тры асобныя, і ужо ў 1966 годзе існавалі самастойна саўгасы «Падольскі», «Кямелішкі», «Рытаньскі».

Мяняліся людзі, спецыялісты, ішло тэхнічнае пераўззбраенне сельскагаспадарчай вытворчасці, будаваўся і мацнеў саўгас «Падольскі». Пік яго славы прышоўся на 1970-80-я гады. Ураджайнасць збожжавых складала ад 27 да 34 цэнтнераў з гектара, бульбы - ад 180 да 230 ц, гадавыя надоі малака ад каровы перавышалі 3000 кг. На свінаферме штогод атрымлівалі па 6 і больш тысяч парасят. Саўгас быў уключаны ў групу племгаспадарак рэспублікі. Саўгасныя свінкі і цялушкі раскупляліся не толькі ў раёне і вобласці, але і ў Літве, Латвіі, Казахстане, Калінінградскай вобласці Расіі. У Каранятах і Падольцах былі пабудаваны выдатныя жывёлагадоўчыя комплексы, дзе былі выдатныя кароўнікі, цялятнікі, свінарнікі. Але галоўнае, былі створаны для працаўнікоў адменныя умовы працы і адпачынку, «чырвоныя куткі» і гэтак далей. Многія калгасы і саўгасы зайздросцілі працаўнікам саўгаса «Падольскі».

Шмат увагі надавалася культурна-бытавому, жыллёваму будаўніцтву і добраўпарадкаванню. У 1978 годзе сваіх першых выпускнікоў выправіла ў людзі сярэдняя школа, звонкім дзіцячымі галасамі азваўся сучасны дзіцячы садок на 90 месцаў з плавальным басейнам.

Вуліца Маладзёжная з двухпавярховымі катэджамі, гандлёвы цэнтр, гасцініца - упрыгожылі вёску. У многія дамы прыйшло цяпло ад цэнтральнай кацельнай. Папрыгажэў, змяніўся мехдвор - былі пабудаваны гаражы на 58 аўтамашын і на 50 трактароў, крытыя стаянкі для камбайнаў і іншай тэхнікі. Вуліцы вёскі пакрыліся асфальтам.

Усе гэтыя даброты ствараліся слаўнымі працаўнікамі саўгаса, якія пераянялі эстафету ад тых, першых, якія стаялі ля вытокаў саўгаснага жыцця і знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Многіх з іх ужо няма з намі, але падальчане памятаюць іх удзячнай памяццю.

За сваю самааданную працу многія працаўнікі саўгаса былі узнагароджаны высокімі ўрадавамі узнагародамі. Так калішні брыгадзір брыгады Свіранкі Іван Францавіч Валодзька быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Каля 20 гадоў пасля выхаду на пенсію, працаваў жывёлаводам у саўгасе ветэран вайны, былы першы старшыня калгаса у Падольцах Іосіф Францавіч Бакевіч, шмат годоў аж да пенсіі працавалі даяркамі Рэгіна Буйка, Станіслава Валодзька, Генуэфа Акушка, Яніна Валодзька і іншыя. Спачатку аграномам, а потым загадчыцай цяплічнай гаспадаркі працавала шмат гадоў Ніна Іванаўна Асмаковіч. Семнаццаць гадоў - з 1970 па 1987 год - саўгас ўзначальваў умелы гаспадар і талковы кіраўнік Леанід Сцяпанавіч Рубан.

# Адукацыя і яе роля ў жыцці падальчан на пачатку 20 ст.

Першая школа, якую наведвалі жыхары Падольцаў, была школа у в. Попішкі. Навучанне вялося на польскай мове, вучыліся у дзве змены. Пазней была адкрыта школа у в. Буцюрмы, навучанне вялося таксама на польскай мове. У 1930-я гады была адкрыта школа у Падольцах, навучанне вялося на рускай і польскай мовах, настаўнікам працаваў Пільвінскі Вацлаў. У 1949 годзе школа была пераведзена у будынак былога кулака Валодзька Яфіма, які быў высланы з вёскі, а потым пераехаў у Польшчу.

Дырэктарам пачатковай школы працаваў Казулак О. К. У 1957 годзе дырэктарам Падольскай пачатковай школы была прызначана Калач Вольга Віктараўна, настаўніцай Сідарук Вольга Герасімаўна. У 1977 годзе была пабудавана новая Падольская СШ на 392 вучнёўскія месцы. У 1978 годзе адбыўся першы выпуск навучэнцаў школы. Найбольшая колькасць вучняў была ў 1977 – 1978 навучальным годзе – 301, найменшая – у 1992 г. – 107. За 21 год закончылі школу 324 вучні, 56 з іх паступілі ў ВНУ (35 у педагагічныя), 30 – у тэхнікумы, 48 – у ПТВ. Базавую школу за гэты перыяд закончылі 416 вучняў.

З залатым медалём школу закончылі 9 вучняў:

Зубанава Таццяна
Аўсюкевіч Людміла
Шаблінская Святлана
Шылько Жана
Качкан Аксана
Шаблінская Ірыны
Мізей Вольга
Ступенка Таццяна
Кананові Іна

З сярэбраным медалём закончылі школу:

Буйка Алена
Ермалінская Ганна
Закудоўская Алена
Печатоўская Жана
Саўко Снежана
Качкан Таццяна
Мароз Лілія
Бабіч Людміла

Усе медалісты атрымалі вышэйшую адукацыю ці вучацца зараз. 7 былых выпускнікоў школы працуюць настаўнікамі ў роднай школе. Зараз у школе працуюць 22 настаўнікі, з іх 17 жанчын.

Першым дырэктарам сярэдняй школы была Рубан Лідзія Іванаўна, з 1989 да 2004 года школу узначальваў былы завуч школы Мізей Вацлаў Іпалітавіч. Намеснікамі дырэктара па навучальнай і выхаваўчай рабоце у розныя гады былі: Печатоўская Л.І., Сасноўская В.А., Цорах Л.У., Рынкевіч М.К., Сідарэвіч Р.А., Кандрацюк С.І.

Вялікая ўвага надаецца адраджэнню традыцый народнай мастацкай творчасці, за што школа была ўзнагароджана ў 1985 г. Дыпломам І ступені ВДНГ СССР.

# Культурна-асветніцкая і прапагандысцкая дзейнасць у савецкі і цяперашні час

Яшчэ пры дзейнасці Падольскай МТС пры палітаддзеле была хата-чытальня (больш дакладна, свая невялікая бібліятэка, у якой было некалькі соцень кніг). У асноўным былі кнігі савецкіх аўтараў на рускай мове, спецыяльная літаратура па с/г тэхніцы, часопісы, газеты.

Чытачамі бібліятэкі, у асноўным, з'яўляліся спецыялісты МТС. Палітаддзел МТС праводзіў агітацыйна-масавую работу не толькі сярод механізатараў, але і ва ўсіх калгасах, якія абслугоўвала МТС; агітацыйна-масавая работа была накіравана на ўзмацненне працоўнай дысцыпліны, выкананне планаў і абавязкаў пяцігодак. У 1951 годзе быў пабудаваны драўляны клуб, дзе праводзіліся асноўныя выхаваўчыя мерапрыемствы: агульныя сходы, ушанаванне пераможцаў спаборніцтваў, дзейнічала мастацкая самадзейнасць, дэманстрываваліся кінафільмы. Гэты сціплы клуб быў цэнтрам культурнага жыцця вёскі да 1989 года, да таго часу, калі ў Падольцах святочна расчыніў дзверы і сустрэў прыгажосцю сваіх наведвальнікаў новы Дом культуры.

У 1960-я гады, а больш дакладна, пасля рэарганізацыі МТС, бібліятэка была перавезена з майстэрні ў памяшканне адміністрацыйнага будынка, дзе была кантора саўгаса, сельскі савет, АТС, пошта, лясніцтва. Пакойчык бібліятэкі быў цесны, з адным акном і пячным ацяпленнем, сцелажы былі прымітыўныя, а на іх размясцілася каля 2 тысяч кніг. У 1975 годзе бібліятэка была пераведзена ў прыбудаванае да клуба памяшканне, больш прасторнае (6 х 8 м), светлае, з 4 вокнамі. Там ужо было 12 сцелажоў і кніжны фонд складаў боьш за 5 тысяч экземпляраў, у бібліятэку выпісвалася каля 20 часопісаў і 10 найменаванняў газет.

У бібліятэцы  было пастаўлена 6 сталоў, дзе маглі пачытаць газеты і паглядзець часопісы наведвальнікі. Для бібліятэкі набылі магнітафон з цікавымі запісамі музыкі, тэлевізар. Колькасць чытачоў штогод павялічвалася і складала ў 1980-я гады больш за 300 чытачоў.  Калі у 1989 годзе быў перабудаваны Дом культуры, там размясцілася і сельская бібліятэка з прыгожай, утульнай залай для наведвальнікаў і кніжным фондам больш за 12 тысяч кніг. Амаль чвэрць стагоддзя загадчыцай бібліятэкі працавала Мізей Анастасія Пятроўна – сціплая адказная працаўніца, умелы дарадчык.

# Яны загінулі за Радзіму

У цэнтры вёскі Падольцы у 1968 годзе пастаўлены абеліск на ушанаванне памяці землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Шаблінскі Іван Антонавіч
Баран Вітольд Акзэльмавіч
Бабіч Іван Іванавіч
Сямашка Станіслаў Мікалаевіч
Хаткевіч Франц Аляксандравіч
Цэйка Браніслаў Браніслававіч
Макевіч Баляслаў Антонавіч
Сямашка Іван Станіслававіч
Валодзька Станіслаў Ігнатавіч
Лось Іосіф Іосіфавіч
Лось Валерый Міхайлавіч
Валуевіч Антон Іванавіч
Гаспер Тамаш Іванавіч
Хомскі Ягор Іосіфавіч
Валуевіч Антон Антонавіч
Лось Іосіф Адамавіч
Андрэеў Іван Данілавіч

22 жніўня 1942 г. на хутары Падмядзіна фашысты растралялі 22 мірныя жыхары Стрыпішак. Ім пастаўлены на месцы растрэла абеліск.

Григорьев Федор Ильич
Демидов Иван Юпатович
Демидов Кирсан Агафонович
Зубанов Иван Игнатьевич
Зубанов Иван Никифорович

Зубанов Авдей Илларионович
Зубанов Селивон Илларионович
Зубанов Иван Никитович
Иванов Степан Васильевич
Иванов Михаил Кириллович
Иванов Авдей Терентьевич
Кудинов Иосиф Калинович
Кудинов Юпат Калинович
Кудинов Фрол Калинович
Морковский Василий Леонович
Медяков Кирилл Алистратович
Наумов Евстафий Алерьянович
Никитин Сергей Аникеевич
Чепулковский Феликс Эдуардович
Чепулковский Иван Михайлович
Шнуров Ермолай Михайлович
Шнуров Иван Иванович

# Стрыпішкі

«Святая Русь» - так любоўна названы адзін куточак нашай мясцовасці. Для большасці насельніцтва Астравеччыны гэтая назва ні аб чым не гаворыць. Але толькі не для жыхароў Падольскага сельскага Савета. Яны добра ведаюць гэты маляўнічы, даволі глухі куточак зямлі на паўночным захадзе ад Падольцаў, усяго ў 15 км. Тут на працягу стагоддзяў жывуць стараверы або стараабрадцы - людзі, якія амаль ад хрышчэння Русі захоўваюць свае абрады, традыцыі, мову.

Шмат вякоў праваслаўе - з 10 стагоддзя, каталіцызм - з 14 стагоддзя, пратэстантызм і уніяцтва - з 16 стагоддзя распаўсюджвалі на беларускіх землях свае ідэі. Для гэтай мэты засноўваліся кляштары, узводзіліся храмы, ствараліся брацтвы, адкрываліся школы, выдаваліся кнігі рэлігійнага зместу, рыхтаваліся святары. Але ўсё гэта не характэрна для такой галіны праваслаўя, як стараверства. Ва ўсе часы стараверы былі пад пільным наглядам як дзяржаўных свецкіх уладаў, так і афіцыйнай праваслаўнай царквы. Але нягледзячы на ўсе цяжкасці і перашкоды, стараверы на Беларусі захавалі сваю веру, традыцыі, культуру. І толькі Усерасійскі Сабор у 1917 годзе у Маскве адмяніў «клятвенныя забабоны» і звярнуўся да праваслаўных, у тым ліку і да старавераў, з адозвай аб згодзе і яднанні.

Зараз у рэспубліцы існуюць дзесьці каля 26 абшчын старавераў. Расселены яны ў Гомельскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і ў незначнай колькасці ў Гродзенскай вобласці. Гаворачы аб вытоках стараабраднііцтва, неабходна зрабіць экскурс ў гісторыю гэтак гадоў на 350 назад. Цар Аляксей Міхайлавіч і маскоўскі патрыярх Нікан у сярэдзіне 17 стагоддзя вырашылі

ажыццявіць рэформу ў афіцыйнай праваслаўнай царкве. За перыяд ад прыняцця хрысціянства многае змянілася ў традыцыях і абрадах, усе царкоўныя кнігі падлягалі перапісванню. Вось некаторыя наваўвядзенні, прапанаваныя Ніканам народу: двухперснае жагнанне замянялася трохперсным, імя Хрыста пішацца з двумя «І»: Іісус замест прынятага Ісус, іконы пішуцца на любым матэрыяле і ўпадабляюцца звычайным карцінам, у той час як стараабрадніцкія іконы пішуцца алеем па дрэву, або вырабляюцца з металу.

Але не толькі гэтыя наваўвядзенні правялі да расколу ў афіцыйнай царкве. У 17 стагоддзі праваслаўная царква была буйнейшым феадалам: мела сваіх прыгонных сялян, свае землі, промыслы, атрымлівала прыбыткі ад пасяленняў на манастырскіх і царкоўных землях.Царкоўныя багацці не падлягалі афіцыйнаму ўліку. Усё гэта і выклікала незадаволенасць народа, падаў аўтарытэт царквы. Такім чынам, стараабрадніцтва было народжана сацыяльнымі супярэчнасцямі, выкліканымі прыгонным правам. Яно выспела ў недрах рускай праваслаўнай царквы, а царкоўная рэформа патрыярха Нікана паслужыла толькі фармальнай падставай для расколу. Пасля расколу праваслаўнай царквы стараабрадніцтва хутка распаўсюдзілася па ўсей тэрыторыі Расіі. Ратуючыся ад ганенняў і праследвання з боку афіцыйных ўлад і царквы, стараверы пакідалі родныя мясціны і шукалі прытулак ў глушы сібірскай тайгі, сярод балот, часта сяліліся ў суседніх краінах. Так яны трапілі на беларускія землі.

Перасяленне за мяжу і асабліва ў Рэч Паспалітую, давала старaверам магчымасць захаваць сваю маёмасць, таму што тут раскол у царкве не лічыўся ерассю, а веруючых не падвяргалі ганенням. Спецыяльная камісія, якая разглядала справу старaверніцтва, не знайшла ў старавераў нічога крамольнага і прыйшла да высновы, што яны «не належаць да ліку небяспечных для дзяржавы і царквы сектантаў».

Вялікі размах набываюць уцёкі з рускіх зямель у першай палове 18 стагоддзя, а асабліва падчас рэформаў Пятра Першага.

Згодна з дадзенымі Сената ад 17 верасня 1772 года толькі за перыяд з 1719 па 1736 год пакінулі месца свайго пастаяннага

жыхарства 442 тысячы стараабрадцаў. Як паведамляюць розныя крыніцы, больш за 100 тысяч старавераў накіраваліся на беларускія землі. З тых часоў і жывуць у нашым краі староверы.

На тэрыторыі Падольскага сельсавета два пасяленіі старавераў - Стрыпішкі і Ясень.

Стрыпішкі - гэта абагульненая назва месца іх пасялення. На самой справе гэта цэнтральны хутар, дзе стаяла (і зараз яшчэ стаіць) царква, была школа-сямігодка (зараз застаўся толькі падмурак, а сам будынак разабралі). Царкву і школу пабудавалі па ўказанню ўлад у 1903 годзе, а да гэтага існавала малельня на хутары Зароўі.

Паводле успамінаў старажылаў (а іх ужо засталіся адзінкі) Рыгора Нікадзімавіча Тачылава і Агаф'і Карнеяўны Андрэявай, некалі ў гэтай мясцовасці было больш за 150 хутароў. Практычна кожны меў сваю назву: Ройсцішкі, Бруханішкі, Ляшчынава, Зароўе, Таборы, Падмядзіна і іншыя.

Непасільная, найцяжэйшая праца ператварыла ў свой час гэтыя «гіблыя мясціны» у край, дзе жылі сотні людзей. Яшчэ і зараз сярод кустоўя на ўскрайках лясоў можна знайсці старыя меліярацыйныя каналы, выкапаныя ўручную. Сярод лесу трапляюцца паляны, на якіх засталіся падмуркі былых пабудоў, растуць напаўздзічэлыя пладовыя дрэвы. Усё гэта сведчыць аб тым, што яшчэ гадоў 20-30 таму назад тут кіпела жыццё. Падчас выбараў у мясцовыя органы ўлады  17 чэрвеня 1973 года тут пражывала 128 чалавек дарослага насельніцтва, якія мелі права голасу, у Стрыпішскай школе навучалася 46 вучняў, падрастала 19 дашкалят.

Дакументальна падцвердзіць больш дакладна перыяд пасялення старавераў у нашай мясцовасці не ўяўляецца магчымым (прыкладна пачатак 18 ст.). Але яшчэ ў 70-я гады з гутарак са старажылам Міхайлам Васільевічам Андрэевым (пражыў 98 гадоў), Якавам Кандрацьевічам Занавым і іншымі стала вядома, што іх бацькі, дзяды і прадзеды жылі тут заўсёды, займаліся сельскай гаспадаркай, цяжкай працай здабывалі хлеб для сваіх мнагадзетных сем'яў, свята захоўвалі традыцыі, зберагалі родную мову, адзначалі святы. Сем'і традыцыйна ствараліся з

адзінаверцаў, а змешаныя шлюбы забараняліся, дзяўчаты выходзілі замуж з 16 гадоў, мужчыны жаніліся у 21, Але сустракаліся і больш раннія шлюбы з 13-15 гадоў.

У сувязі з тым, што гэтая галіна стараістараў адносілася да папоўцаў (гэта значыць, што у адносінах паміж чалавекам і Богам прызнаюць пасрэдніка «бацюшку») царква была месцам жаданым і прыцягальным для ўсіх жыхароў Стрыпішак. Другім такім месцам агульнага збору тутэйшых жыхароў былі могілкі, якія ва усе часы утрымліваліся ва ўзорным парадку. І зараз на Тройцу сюды з'язджаюцца сотні людзей да родных, якія знайшлі вечны супакой на гэтых могілках.

«Святая Русь» - зараз даволі пустыннае месца. На вялізнай тэрыторыі, больш за 1000 гектараў лесу, балот, палёў, жывуць усяго 4 чалавекі. Час - вялікі рэфарматар: моладзь пацягнулася да цывілізацыі і паступова адыйшла ад традыцыі бацькоў. Большасць маладых людзей у 70-80-я гады выехала ў суседнюю Літву, старыя людзі паўміралі. Такім натуральным чынам змяншалася насельніцтва «Святой Русі». У гады Вялікай Айчыннай вайны многія са старавераў са сброяй у руках абаранялі сваю Радзіму, многія склалі галаву на полі бою, некаторыя вярнуліся дадому інвалідамі. Не абмінула віхура вайны і саму «Святую Русь», і толькі нямы сведка - абеліск на хутары Падмедзіна нагадвае аб тым, што на гэтым месцы фашысты расстралялі 22-х маладых мясцовых жыхароў, пасля таго, як у раёне станцыі Лынтупы партызанскі атрад пад кіраўніцтвам Ф. Маркава правёў чарговую паспяховую аперацыю. У 50-я гады, напачатку калектывізацыі, тут быў створаны калгас, дарэчы, не з горшых у Падольскім сельскім Савеце. У калгасе было 50 дойных кароў, цяляты. Старшынёй калгаса быў мясцовы жыхар Занаў Фама Сафонавіч. У 1959 годзе калгас увайшоў у склад новай гаспадаркі - саўгас «Падольскі».

Пройдзе няшмат гадоў, адыдуць у іншы свет цяперашнія жыхары, і пра «Святую Русь» забудуць нават у Падольцах. Вельмі хацелася б, каб гэтага не здарылася.

Вёска Ясень - другое паселішча старавераў на тэрыторыі сельсавета. Тут жылі Сцяпанавы, Плотнікавы, Чапуковы, Зубанавы, Сідаравы. Старажылы тутэйшых мясцін - Гаўрыла

Іларыёнавіч Плотнікаў і яго жонка Анастасія Аўдзееўна. Гаспадар нарадзіўся на хутары Шайкуны, якім валодалі паны Сволькены. У Ясень пераехаў пасля жаніцьбы. Жонка - уражэнка Швенчонскага раёна Літвы. Да калектывізацыі сям'я мела 10 га зямлі, пасля стварэння калгаса, у 1950 годзе, Гаўрыла Іларыёнавіч аж да свайго 70-годдзя працаваў конюхам: спачатку ў калгасе, а затым у саўгасе; вырасціў і абучаў не адзін дзесятак маладых каней. Стараабрадніцкія традыцыі і законы ў сям'і ў вялікай пашане. Дзеці ўсе хрышчаны, унукі - таксама. Старэйшына сям'і не ўжывае гарэлкі, не курыць, трымае ўсе пасты. Жонка таксама вельмі набожная, добра ведае гісторыю стараабрадніцтва (у асаблівай пашане у яе - заснавальнік стараверства пратапоп Авакум), мае каляндар усіх рэлігійных свят. Сям'я дружна жыла з суседзямі.

Гаўрыла Міхайлавіч Сцяпанаў больш за 30 гадоў адпрацаваў механізатарам у саўгасе, зараз на пенсіі. Трыццаць тры гады прарабіў трактарыстам Малаф Леонавіч Зубанаў. Прычым, заўжды быў надзвычай акуратным, адказным, дакладным пры выкананні любой работы.

Як бачна, стараверы ў Падольцах былі не чужынцамі - пустэлінікамі, а людзьмі паважанымі, законапаслухмянымі, годнымі ўдзячнай памяці.

# Свіранкі

Сваё імя вёска атрымала, па меркаванню, ад слова “свіран”. Ёсць звесткі аб тым, што ў мясцовых паноў было многа пабудаваных свірнаў для збожжа з гэтай мясцовасці, так як землі вакол Свіранак ўрадлівыя, сам жа панскі маёнтак знаходзіўся за 10 км ад сучасных Свіранак, менавіта ў вёсцы Свіраны (сучасная вёска ў Кемелішскім с/савеце). Потым узнікла паселішча, якое назвалі Свіранкамі.

З дакументаў вядома, што ў 1532 г. Свіранамі і Варнянамі валодалі Юрый і Грыгорый Осцікі. Калі памерла іх сястра, трымалі гэтыя ўладанні супольна, не дзелячы паміж сабой. Пазней Грыгорый Осцік аддаў у заставу Юрыю за 500 коп грошай сваю палову маёнткаў. Юрый Осцік памёр у 1547 г., напісаўшы перад гэтым у 1546 г. тэстамант на карысць жонкі і дзяцей. Адпаведна з тэстамантам ён запісаў грошы на братавай палове маёнткаў на правядзенне свайго пахавання 100 коп грошай, на выхаванне і вучобу малодшых непаўналетніх сыноў Юрыя і Грыгорыя 400 коп грошай і даручыў іх у апеку брату Грыгорыю. Вядома, што апошні не выкупіў сваю палову маёнткаў і памёр у 1557 г. не маючы дзяцей. Відаць, свае ўладанні ён падараваў пляменнікам, як нашчадкам.

Згодна з тэстамантам Ю. Г. Осціка 1546 г., пяць частак маёнткаў Свіраны і Варняны пераходзілі ў спадчыну братам Юрыю і Грыгорыю Юравічам Осцікам пасля дасягнення імі паўналецця. Некаторы час маёнткі трымала іх маці княгіня Марыя Міхайлаўна Мсціслаўская, а недзе адразу пасля 1557 г., атрымаўшы як бацькоўскія, так і дзядзькавы часткі маёнтку, усе яны ўчынілі згоду паміж сабой, адпаведна якой Варняны дасталіся Юрыю, а Свіраны Грыгорыю. Як сведчыць “Опіс войска ВКЛ” у

1567 г. Свіраны трымала ў заставе ад мужа Грыгорыя Осціка Ядвіга Юр'еўна Насілоўская, а Варнянамі валодаў Юрый Осцік.

Падзеі Лівонскай вайны закранаді і нашы мясцовасці. Так Грыгорый Осцік меў тайныя зносіны з маскоўскім паслом у Вільні адносна захопу ВКЛ Масквою. У сваім маёнтку Каварск (цяпер Літва) ён арганізаваў падпольны манетны двор, дзе чаканіўфальшывыя манеты і пячаткі, складаў падробленыя дакументы. Калі гэта выявілася, Грыгорый Осцік быў арыштаваны і каралеўскім судом Рэчы Паспалітай (кароль Стэфан Баторый) 15 чэрвеня 1580 г. асуджаны да пакарання смерцю, а 18 чэрвеня прыгавор быў прыведзены ў выкананне.

Усе маёнткі здрадніка былі канфіскаваны на карысць дзяржаўнага скарбу, частку іх кароль падараваў за ваенныя заслугі Яну Абрамовічу. Такім чынам Свіраны сталі ўладаннем роду Абрамовічаў. Ян Абрамовіч памёр у 1602 г., а ўжо ў наступным 1603 г. яго сын Мікалай Абрамовіч прадаў маёнтак Паўлу Прагульбіцкаму. Якім чынам маёнтак Свіранкі (так фігуруюць Свіраны з першай паловы 17 ст.) аказаўся ва ўладанні духоўных установ, дакладна невядома. Вядома толькі, што Віленская капітула ў 1671 – 1690 гг. сваім коштам пабудавала драўляны касцёл у Свіранках.

Самымі распаўсюджанымі прозвішчамі для ранніх Свіранак з'яўляліся Казлоўскія, Хаткевічы, Ласі, Крывіцкія, Радзевічы, Бабічы, Шаблінскія.

У мінулым вёска Вялікія Свіранкі была такой жа як і большасць беларускіх вёсак. Сяляне валодалі надзеламі зямлі (пасля адмены прыгоннага права). У залежнасці ад таго, які па памерах і ўрадлівасці быў надзел, сяляне дзяліліся на бедных і заможных. Беднякі (безлашадныя) збывалі свае надзелы і ішлі ў найм да заможных. Частка сялян, якія мелі недастаткова зямлі і вялікія сем'і, наймаліся да багатых на сезонныя работы. Аплата працы вялася пудамі ці грашыма. Большасць хатаў у вёсцы былі невялікімі па памерах, стрэхі пакрываліся саломай, якую ў неўрадлівыя гады здзіралі на корм жывёле.Весь посуд быў

гліняны, рэдка ў заможных сялян сустракалі металічныя патэльні і кубкі. Вёдры, дзежкі, цэбры, начоўкі былі драўлянымі.

Падлога ў хатах была выбіта з гліны. Вопратка шылася з самаробных тканін. Амаль у кожнай хаце былі кросны, на якіх ткалі ільняную, шарсцяную тканіны. Вялікай павагай карысталіся саматканыя ручнікі, дываны, сурвэткі. Кожная гаспадыня мела ў куфары лепшае з таго, што было дадзена як пасаг, і дочкам старалася зрабіць яшчэ лепшае.

Верасень 1939 г. унёссвае карэктывы ў паўсядзённае жыццё вяскоўцаў. Усіх цікавіла, што такое Савецкая ўлада, як прыйдзецца жыць. У касцёле засцерагалі, што прыйшоў час антыхрыста, блізка канец свету. Але выбары ў мясцовыя органы ўлады прайшлі арганізавана.

Вайна для жыхароў Сіранак пачалася ў 1939 г. Мабілізавалі ўсіх, хто павінен быў пайсці на вайну, забралі коней, адбылася рэквізіцыя прадавольчых тавараў, адзення. І да 1944 г. вёска жыла ў акупацыйным рэжыме. Немцы ўсю ўладу перадалі літоўцам, якія пачалі ўводзіць свае парадкі: выдалі літоўскія пашпарты, увялі падаткі (колькі здаць малака, яек, воўны і г. д.), выбралі сваіх солтысаў. У наваколлі дзейнічалі партызаны, якія часам наведвалі вёску.

У 1944 г. прыйшла Чырвоная Армія. Адбылася новая мабілізацыя, цяпер ужо ў Чырвоную Армію. Пайшлі на фронт Баран Іосіф, Шаблінскі Альфонс, Шаблінскі Станіслаў, Крывіцкі Іван, Аўсюкевіч Іосіф, Лось Казімір, Шаблінскі Іван, Бабі Іван. Усе яны сустрэлі перамогу ў 1945 г.

А пасля вайны вёска жыла сваім паўсядзённым жыццём. Вярнуліся з вайны франтавікі. Вядзенне гаспадаркі засталося ранейшым. Кожны двор апрацоўваў сваё поле. Жыццё было цяжкім, не хапала коней, с/г прылад.

У 1950 г. новыя змены закранулі вёску: пад кіраўніцтвам партыйных і савецкіх органаў распачалася калектывізацыя. У Свіранках быў арганізаваны калгас “Труд”. Насельніцтва запісвалася ў калгас прымусова, вялося абагульненне жывёлы, інвентара, гумен. Калгасныя палі апрацоўваліся першы год коньмі, а ў 1950 г. у Падольцах было створана МТС, і на палі выйшлі

трактары. Спецыялізацыя калгаса была разнагаліновая, была свінаферма, малочна-таварная ферма, гадавалі гусей. У 1959 г. калгас увайшоў у склад новастворанага саўгаса "Падольскі".

Да 1934 г. у Свіранках не было тыповай школы. Арандавалі ў каго-небудзь хату, і там вялося навучанне. Звычайна такія школы былі малакамплектнымі, там працаваў адзін настаўнік, навучанне вялося на польскай мове. У 1934 г. у Свіранках была пабудавана тыповая пачатковая школа. Навучанне вялося ў 4-х класах, працавалі два настаўнікі. Дырэктарам школы быў Мечыслаў Пяхота. Настаўнікі мелі добрую спецыяльную падрыхтоўку, ведалі замежныя мовы. У вайну школа не працавала. Памяшканне школы нават хацелі спаліць ці то немцы, ці то акаўцы. Дырэктару школы, які жыў у школьнай кватэры прыйшлося слёзна прасіць аб літасці, і школу не спалілі.